Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

№ 8 (62) ' 2007

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**М. І. МІНІЦКІ** — галоўны рэдактар, *кандыдат гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ** — першы намеснік галоўнага рэдактара, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА** — намеснік галоўнага рэдактара, *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА** — адказны сакратар
**І. І. БАГДАНОВІЧ**, *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ**, *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН**, *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА**, *кандыдат гістарычных навук*
**Л. У. ЖЭРКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ** — старшыня
**М. М. ЗАБАЎСКІ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА**, *доктар педагагічных навук*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН**, *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец —**
**РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

220070, г. Мінск, вул. Будзённага, 21; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http://www.aiv.by

# ГІСТОРЫЯ
## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ


**ТЭОРЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ**

3 **Ухванова-Шмыгова Ирина, Ильюшина Лилия**
Цивилизация как открытая динамическая система: взгляд с позиции каузально-генетического моделирования

**ДЫДАКТЫКА І ТЭХНАЛОГІІ**

9 **Пляшкевич Лидия, Бушило Алла**
Использование иллюстраций на уроках по истории цивилизации Древнего мира

16 **Соболевская Зоя**
Применение интерактивных методов обучения

24 **Молош Елена, Чупик Данута**
Игровые формы обучения как средство активизации познавательной деятельности на уроках истории

34 **Федотова Ольга**
Основы белорусской государственности

**МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ФАКУЛЬТАТЫВАЎ**

37 **Лизунова Елена**
Обучение способам деятельности с картографическим материалом при изучении истории в пятом классе

45 **Фядзечка Сяргей**
Нелегальная эміграцыя ў беларуска-польскім памежжы ў міжваенны час

48 **Минич Александр**
Публикация исторических источников в Республике Беларусь в 90-е годы XX века

**ГІСТАРЫЧНЫЯ АСОБЫ**

54 **Варанько Кацярына**
Да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі

**ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ**

56 Инструктивно-методическое письмо Министерства образования Республики Беларусь к 2007/08 учебному году. История


*Для оформления первой и четвертой страниц обложки журнала использованы иллюстрации из книги: Н. Дмитриева. Краткая история искусств. – М. : АСТ-ПРЕСС, Галарт, 2000. – 623 с. : ил.*


© РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2007
© Вокладка. Р. А. Раманцоў, 2007

# НЕЛЕГАЛЬНАЯ ЭМІГРАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІМ ПАМЕЖЖЫ Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС

*Сяргей Фядзечка, выкладчык Палескага дзяржаўнага універсітэта (г. Пінск)*

У гісторыі Беларусі дастаткова прыкладаў эміграцыі насельніцтва. Асабліва вызначаўся ў гэтым сэнсе перыяд напрыканцы XIX — пачатку XX ст. Найбольш значнымі падзеямі былі:

- масавая міграцыя падчас сталыпінскіх рэформаў у Сібір (у 1904–1914 гг. з беларускіх губерняў выехала 356 378 чалавек), у Паўднёвую і Паўночную Амерыку (у 1903–1913 гг. — 1,5 млн чалавек), у Германію (у 1912 г. — 100 000) [1];
- перасяленне бежанцаў падчас Першай сусветнай вайны на Усход (у пачатку кастрычніка 1915 г. каля Рэчыцы знаходзілася 64 000, да пачатку 1916 г. у Мінскай губерні — больш за 157 000, у Віцебскай — 90 000. Усяго іх колькасць склала каля 1 млн чалавек) [2].

Заканчэнне ваенна-палітычных канфліктаў на пачатку 1920-х гг. прывяло да афармлення новых геапалітычных умоў існавання народаў Усходняй Еўропы і выклікала новую хвалю эміграцыі. У міжваенны час легальная эміграцыя ў Паўднёвую і Паўночную Амерыку мела пераважна эканамічныя карані і не давала дастатковага ўяўлення аб сацыяльна-палітычных працэсах на тэрыторыі Беларусі. Працэсы эміграцыі шырока даследаваліся беларускімі навукоўцамі, але асобнай з'явай была нелегальная эміграцыя на савецка-польскай мяжы. Тым не менш у беларускіх архівах знаходзяцца дакументы мясцовага польскага кіраўніцтва [3] і Корпуса пагранічнай аховы [4], на падставе якіх можна яе прааналізаваць.

Нелегальная эміграцыя адбываецца па-за юрысдыкцыяй улад, і таму любая афіцыйная інфармацыя па гэтым пытанні звычайна недасягальная. Нелегальным эмігрантам наогул лічыцца чалавек, які незаконна пражывае ў іншай краіне. Таму ён лічыцца «незадакументаваным рабочым», асобай, што не мае права грамадзянства, ці незаконным эмігрантам [5].

Падзеі, якія адбываліся па абодва бакі польска-савецкай мяжы ў 1929–1933 гг., абвастрылі супярэчнасці ў грамадстве. Нелегальная эміграцыя 20–30-х гг. XX ст. непараўнальная па маштабах з міграцыяй на пачатку стагоддзя. Па яе характары можна зрабіць высновы аб сацыяльна-палітычных і эканамічных працэсах у суседніх краінах, а таксама, разгледзеўшы нацыянальны склад эмігрантаў, вызначыць этнічны аспект праблемы.

Нелегальны міграцыйны рух праз польска-савецкую мяжу з Заходняй Беларусі ў пачатку 30-х гг. быў выкліканы перш за ўсё крытычным станам эканомікі з польскага боку і калектывізацыяй — з савецкага. Крушэнне Уол Стрыт (Wall Street) у 1929 г. моцна ўздзейнічала на эканоміку еўрапейскіх краін. Такія галіны прамысловасці, як апрацоўка металаў, дрэваапрацоўка і будаўніцтва апынуліся ў цяжкім становішчы. У выніку ў Еўропе моцна ўзрасла колькасць беспрацоўных. Фінансавыя цяжкасці перажывала і сельская гаспадарка. Многія малыя гаспадаркі не вытрымалі крызісу і спынілі існаванне. Наогул, сацыяльная абарона насельніцтва была кепска арганізавана, і шмат людзей, пераважна вяскоўцаў, былі вымушаны шукаць работу за межамі сваёй краіны.

Раней Амерыка была запаветнай зямлёй для вялікай колькасці беларусаў. У 1920-х гг. урад Злучаных Штатаў прыняў больш жорсткую эміграцыйную палітыку, якую падтрымала Канада. Пасля гэтага толькі некалькі соцень беларусаў маглі атрымаць магчымасць эмігрыраваць у ЗША кожны год. У першыя гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вялікая колькасць людзей з заходніх краін звярталася да савецкай улады па дазвол на эміграцыю ў СССР, большай часткай з іх у гэтым адмаўлялі. У 1920-х гг. рабочым з заходкіх краін дазваляўся пераезд у

СССР толькі праз так званыя канцэсіі, распаўсюджаныя ў час нэпа, як адны з формаў існавання заходніх прадпрыемстваў на тэрыторыі СССР.

У 1930-я гг. асноўныя сродкі, з дапамогай якіх рабочы з заходняй краіны мог апынуцца ў Савецкім Саюзе, былі створаны на падставе тэхнічных пагадненняў аб дапамозе. Улады СССР заключалі кантракты з многімі амерыканскімі, нямецкімі, французскімі і іншымі прадпрыемствамі. Згодна з афіцыйнымі савецкімі крыніцамі, у пачатку верасня 1932 г. у Савецкім Саюзе працавалі 9190 замежных спецыялістаў і 10 655 рабочых, якія знаходзіліся ў краіне разам з сем'ямі. Усяго ў СССР жыло каля 37 500 замежных грамадзян [6]. Гэта лічба, верагодна, уключае ў сябе тых, хто апынуўся на тэрыторыі краіны незаконна.

Падчас Вялікай дэпрэсіі колькасць нелегальных эмігрантаў значна павялічылася. Тысячы людзей пераходзілі мяжу паміж СССР і Польшчай. Падобная з'ява назіралася і на фінска-савецкай мяжы. Гэтай праблеме прысвечана надзвычай мала даследаванняў. Яны тычацца галоўным чынам палітычных бежанцаў, напрыклад, членаў КПЗБ і спачуваючых ім [7].

Аналізуючы дакументы польскага боку, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі ў абласных дзяржаўных архівах Гродна і Брэста, можна сцвярджаць, што колькасць перайшоўшых мяжу толькі ў 1930–1932 гг. складае зафіксаваны мінімум у 2500 чалавек. Дакументацыя па гэтай праблеме носіць спарадычны характар. Ніякіх агульных выніковых дакументаў па праблеме нелегальнай эміграцыі ў абодвух накірунках не стваралася. Аналіз з'явы рабіўся на ўзроўні аналітычных запісак да палескага ваяводы (падобнае ў іншых ваяводствах вызначыць цяжка з-за адсутнасці дакументаў). Маючы на ўвазе нелегальны характар з'явы, можна сцвярджаць, што рэальныя лічбы ў некалькі разоў большыя за пацверджаныя дакументальна. У адрозненне ад вялікай хвалі эміграцыі з Беларусі ў Амерыку, напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзя незаконна ад'язджалі за мяжу пераважна нежанатыя мужчыны з вялікіх сямей ці кармільцы сям'і, якія звычайна пераходзілі мяжу першымі (часцей за ўсё нелегальна). Узроставая структура эмігрантаў нагадвала тую, што і ў Паўночнай Амерыцы. Узрост мужчын (45 %) складаў 20–30 гадоў. З другога боку, значная колькасць эмігрантаў была старэйшая за 50 гадоў.

Пераход мяжы суправаджаўся вялікай рызыкай. Акрамя звычайнай сістэмы пагранічнай аховы стваралася санітарная зона, якая на польскім баку складалася з ідэалагічна сталых *асаднікаў*, а на савецкім — са спецыяльна створаных *«чырвонаармейскіх калгасаў»*, якія камплектаваліся былымі ваеннымі і ўзначальваліся афіцэрамі. Такім чынам, акрамя непасрэдна мяжы трэба было пераадолець прыкладна 20–40 км спецыяльнай зоны [8]. Таму больш напружаным рухам нелегальных эмігрантаў вызначалася Палессе, дзе мерапрыемствы па ахове мяжы дзякуючы прыродным умовам давалі менш плёну.

Пасля 1933 года нелегальная эміграцыя стала меншай. Верагодна, галоўным фактарам быў эканамічны ўздым, у выніку чаго з'явілася больш рабочых месцаў. Другім фактарам была пазіцыя польскіх і савецкіх улад. Абодва бакі не жадалі пасіўна назіраць за гэтай з'явай. Акрамя таго, у гэты час нармалізуюцца адносіны паміж СССР і Польшчай, у ліпені 1932 г. заключаецца пагадненне аб ненападзе. Многія даследчыкі лічаць, што ў гісторыі савецка-польскіх адносін гэта быў перыяд найбольшага збліжэння і супрацоўніцтва [9].

У пачатку 30-х гг. у СССР з-за калектывізацыі былі праблемы з забеспячэннем насельніцтва харчаваннем. Стрымлівалі эміграцыю і беспрычынныя арышты, допыты, турэмнае зняволенне. Шмат хто спрабаваў вярнуцца назад.

Сярод прычын нелегальнай эміграцыі насельніцтва можна вызначыць асноўныя:

1. *Эканамічныя праблемы.* Перш за ўсё гэта глабальны эканамічны крызіс 30-х гг., які моцна адбіўся на адсталых краінах, у тым ліку і ў Польшчы.

2. *Сацыяльна-палітычныя праблемы.* Калектывізацыя ў СССР зрабіла небяспечнай прыналежнасць да заможнай часткі сялянства.

СССР, безумоўна, карыстаўся сваёй ідэалагічнай перавагай сярод бяднейшай часткі насельніцтва. Тое, што рабіла немагчымым жыццё ў СССР багатых сялян, прываблівала сялян-беднякоў з Заходняй Беларусі. Польскія ўлады адзначалі

ўзмоцненую агітацыю з боку СССР, якая грунтавалася на наступных тэзісах:

1. Неабходнасць пабудовы Днепрагэса, на якую замаўлялася 300 тыс. працаўнікоў.

2. Клопат дзяржавы аб матэрыяльным становішчы рабочых і сялян у СССР.

Аддзел бяспекі ПВУ ў сваёй аналітычнай запісцы [10] у Міністэрства ўнутраных спраў Рэчы Паспалітай характарызаваў катэгорыі збеглых у СССР:

1. Скампраметаваныя члены кампартыі (10 выпадкаў).

2. Беспартыйны рэвалюцыйны актыў (7–10 выпадкаў).

3. Шпіёны (10 выпадкаў).

4. Грамадзяне, якія маюць радню ў СССР.

5. Большасць эмігрантаў складалі тыя, хто не меў маёмасці, працы і сімпатызаваў савецкай уладзе.

Асноўнай прычынай нелегальнай эміграцыі з СССР з'яўлялася калектывізацыя. Паказальны тайны даклад столінскага павятовага старасты палескаму ваяводзе ад 04.05.1930 г. [11], у якім прыводзіліся вынікі допыту ўцекачоў:

> Богуш Юліян — ураджэнец сяла Мар'янаўка Жыткавіцкай гміны, аставіў там жонку і дзіця (брат Богуша Станіслаў быў сасланы на Салавецкія астравы на 10 гадоў як супрацiўнік Савецкай улады, другі брат Браніслаў быў сасланы на 3 гады ў Сібір). Сам уцякач ужо знаходзіўся пад арыштам у Жыткавічах, дзе, па яго словах, было сабрана каля 300 чалавек за агітацыю супраць калектывізацыі. Другой турмой такога роду з'яўляецца былы дварэц у Людзеневічах (Ludzieniewicze) Жыткавіцкай гміны *(стыль справаздачы захаваны)*, дзе знаходзілася каля 120 чалавек. Юліян Богуш таксама сведчыць аб сутыкненні паміж незадаволенымі палітыкай калектывізацыі сялянамі вёскі Верасніца (Weresnica) і атрадам войскаў колькасцю да 150 чалавек.
>
> Шукановіч Андрэй — не быў прылічаны да кулакоў, але тым на менш агітаваў супраць калектывізацыі, збег, пакінуўшы дома жонку і двух дзяцей. Адзначаецца моцная рэлігійнасць у праваслаўнай веры.
>
> Лукашэвіч Тадэвуш — збег з-за пагрозы арышту (служыў у польскай арміі).
>
> Дашкевіч Юліян — збег з-за прыналежнасці да каталіцкай веры.
>
> Асецкі і Пракаповіч — няма дакладных дадзеных, утрымліваюцца пад арыштам, ёсць думка, што яны — агенты разведкі.

З верасня па сакавік колькасць эмігрантаў з СССР павялічвалася. У дадзены перыяд асноўныя работы — сяўба і ўборка — завяршаліся і ў пошуках лепшай долі можна было пакінуць асабістую гаспадарку. Уцекачы з Польшчы асабліва не падпарадкоўваліся гаспадарчым справам. Гэта яшчэ раз пацвярджае агульныя прычыны эміграцыі з абедзвюх краін: калектывізацыя ў СССР і эканамічны крызіс у Польшчы.

Дзейнасць улад Польшчы і Савецкага Саюза вызначае стан дзяржаўнай ідэалогіі ў дачыненні да ўцекачоў. Пазіцыі краін прыкладна супадалі: калі польскія ўлады не жадалі выпускаць эмігрантаў (з 301 уцекача 162 было затрымана Корпусам Пагранічнай Аховы), то савецкія ўлады вярталі большасць затрыманых назад (114 чалавек). Наколькі рэгуляваўся такім чынам паток эмігрантаў з СССР у Польшчу, вызначыць немагчыма з-за недахопу інфармацыі аб дзейнасці пагранвойскаў НКУС СССР. Польскія ўлады прымалі ўсіх (з адпаведнай праверкай), у той жа час яны звярталіся да Лігі Нацый па дапамогу, верагодна, чакаючы большай колькасці ўцекачоў ад калектывізацыі і голаду.

Эмігранты-небеларусы складалі меншую частку сярод жыхароў БССР, якія выязджалі за яе межы (малюнак).




**Нацыянальны склад уцекачоў з СССР*.**

* Па дадзеных ПВУ. Нацыянальнасць перабежчыкаў указвалася не заўсёды, часта яе замянялі звесткі пра веравызнанне.

Нелегальную міграцыю на беларуска-польскай мяжы ў 1929–1932 гг. можна вызначыць не толькі як форму сацыяльна-палітычнага пратэсту супраць існуючых абставін, але і як спосаб пазбегнуць залішняй сацыяльнай напружанасці на фоне буйных сутыкненняў пачатку XX стагоддзя.

**Літаратура**


1. Эканамічная гісторыя Беларусі / В. І. Галубовіч [і інш.]; пад рэд. праф. В. І. Галубовіча. — Мінск : Экаперспектыва, 1999.
2. Нарысы гісторыі Беларусі / М. П. Касцюк [і інш.]. — Мінск : Беларусь, 1994. — Ч. 1.
3. ДАБВ. — Фонд 1. — Воп. 9. — Спр. 937; ДАБВ. — Фонд Р–541. — Воп. 1; Фонд 551. — Воп. 1.
4. ЗДАМ. — Фонд Р–5. — Воп. 1. — Спр. 60.
5. *Ellen, M.* Brennan, Irregular Migration: Policy Responses in Africa and Asia / M. Ellen // International Migration Review. — Vol. XVIII. — № 3. — Fall 1984. — P. 409–410.
6. *Корниенко, Л. Н.* Развитие интернациональных связей советского рабочего класса в годы первой пятилетки / Л. Н. Корниенко // История СССР. — 1979. — № 6. — С. 65.
7. *Tomaszewski, J.* Z dziejow Polesia. Zarys stosunkow społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. — Warszawa, 1963.
8. НАРБ. — Фонд 1. — Воп. 11. — Спр. 251. — Арк. 11.
9. *Матерски, В. К.* К вопросу о периодизации польско-советских отношений в межвоенный период / В. К. Матерски // Вестн. Московского ун-та. — 1995. — № 4. — С. 73.
10. ДАБВ. — Фонд 1. — Воп. 9. — Спр. 937. — Арк. 285–286.
11. ДАБВ. — Фонд 1. — Воп. 9. — Спр. 1322. — Арк. 1.